Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-04-19

# Помнікі чакаюць дапамогі

**Напярэдадні Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін, які адзначаецца 18 красавіка, у Нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь праводзілася прэс-канферэнцыя, падчас якой абмяркоўваліся актуальныя пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны.**

►►► 3 стар.

Ігар Грэчка. Помнікі чакаюць дапамогі

◄◄◄ 1 стар.

Арганізацыя падобных прэс-канферэнцый з'яўляецца добрай традыцый і своеасаблівай справаздачай прадстаўнікоў Міністэрства культуры аб праведзенай за мінулы год рабоце па захаванні і аднаўленні помнікаў архітэктуры. На такіх мерапрыемствах, акрамя агучвання сухіх лічбаў, абавязкова даюцца адказы на тыя праблемныя пытанні, якія актыўна абмяркоўваюцца на інтэрнэт-парталах і ў сродках масавай інфармацыі.

Адказы на гэтыя пытанні, безумоўна, жадаюць пачуць і настаўнікі. Хто як ні яны на месцах разам са сваімі выхаванцамі займаюцца канкрэтнымі справамі па даследаванні малой радзімы, паляпшэнні яе турыстычнага патэнцыялу: прыбіраюць смецце ў некалі шыкоўных пакоях былых панскіх сядзіб, добраўпарадкоўваюць старасвецкія паркі, разам з вучонымі ўдзельнічаюць у археалагічных раскопках, захоўваюць прадметы мінулых эпох у школьных музеях.

# Помнікі чакаюць дапамогі

Не будзем засяроджваць увагу на лічбах, што былі агучаны намеснікам міністра культуры Віктарам Іосіфавічам Курашам, на колькасці бюджэтных сродкаў, якія выдаткоўваюцца дзяржавай на аднаўленне тых ці іншых помнікаў архітэктуры. Звернемся да больш канкрэтных пытанняў, якія непасрэдна тычацца дзейнасці педагогаў-краязнаўцаў і іх выхаванцаў. Гэта, напрыклад, правілы правядзення археалагічных раскопак, удзел у якіх для большасці юных краязнаўцаў з'яўляецца адным з любімых заняткаў падчас летніх канікул.

Па словах намесніка начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Аксаны Сцяпанаўны Сматрэнка, Міністэрствам культуры разам з НАН Беларусі падрыхтаваны праект пастановы Савета Міністраў па ўнясенні дапаўненняў і змяненняў у Палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ, якое было прынята ў 2002 годзе. Унесеныя прапановы прадугледжваюць забарону на правядзенне раскопак, разведак, збору археалагічных аб'ектаў і артэфактаў з выкарыстаннем металашукальнікаў, радараў або іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў без атрыманага ва ўстаноўленым парадку дазволу, адкрытага ліста НАН Беларусі. Прыняцце гэтага дакумента — дзейсны крок у змаганні з чорнакапальнікамі.

Яшчэ адзін з важных кірункаў аховы помнікаў, якім займаецца Міністэрства культуры, а таксама настаўнікі і вучні, гэта захаванне паркавых тэрыторый. Так, у мінулым годзе Міністэрствам культуры пры ўдзеле Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, мясцовых выканаўчых органаў на аснове папярэдніх навуковых даследаванняў, выкананых спецыялістамі Акадэміі навук, распрацаваны план мерапрыемстваў па адраджэнні старасвецкіх паркаў, у тым ліку тых, якія ўваходзяць у склад сядзіба-паркавых комплексаў, і тых, што не ўключаны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

— Нам часта здаецца, што ўсё павінна залежаць ад мясцовых органаў улады. Гэта не так. Мясцовая ўлада можа прыняць рашэнне, можа арганізаваць, але на месцах мы ўсе агульнымі намаганнямі таксама многае можам зрабіць. Добрым прыкладам тут з'яўляецца захаванне Крэўскага і аднаўленне Любчанскага замкаў. Звернемся да прыкладу Навагрудскага замка. Усе акцыі, якія праводзяцца па яго добраўпарадкаванні, носяць выхаваўчы характар. Той, хто ахвяруе грошы на яго аднаўленне або ўдзельнічае ў суботніку на Замкавай гары, безумоўна, разумее значнасць нашай агульнай справы. З мэтай далучэння насельніцтва да ўдзелу ў мерапрыемствах па стварэнні ўмоў па зберажэнні Навагрудскага замка была арганізавана спецыяльная акцыя, Навагрудскім райвыканкамам адкрыты разліковы рахунак, на які ўсе нераўнадушныя людзі могуць пералічваць сродкі, — адзначыў старшыня Грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры Анатоль Іванавіч Бутэвіч.

Па словах Анатоля Іванавіча, сёння ў краіне для захоўвання, рэстаўрацыі і аднаўлення помнікаў робіцца вельмі многае. Аднак, на жаль, нямала ў гэтай сферы і пралікаў. Рост грамадскай свядомасці, грамадскай думкі дае спадзяванні на тое, што гэтыя праблемы будуць вырашацца сумеснымі намаганнямі дзяржавы і грамадскасці. Трэба разумна аб'яднаць дзяржаўныя інтарэсы, дзяржаўныя грошы, заканадаўчую базу, намаганні карыстальнікаў гістарычных аб'ектаў і ролю грамадскасці. Ва ўстановах адукацыі гэта разумеюць, слова за іншымі нераўнадушнымі людзьмі.



Дапамогі чакае і Бабруйская крэпасць.

**Ігар ГРЭЧКА.**
*hrechka@ng-press.by*

**Фота аўтара.**